*С. Л. ГАРАНІН, Л. В. ЛЯЎШУН, Мінск*

# СПОСАБЫ СТВАРЭННЯ ВОБРАЗА ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСКІХ ХАДЖЭННЯХ XII–XVI ст. І РАЗВІЦЦЁ МЕМУАРНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Сярод іншых жанраў сярэднявечнай літаратуры хаджэнні вылучаюцца своеасаблівым персаналізмам. Асоба, ад імя якой вядзецца апавяданне, не звычайны падарожнік, а паломнік – чалавек, звязаны з рытуальнай і культавай сферай сярэднявечнай культуры.

На самым пачатку фарміраванне спосабу яго выяўлення было звязана з найбольш важнай мэтай, якую ставіў перад сабой ігумен Данііл: асабіста ідэнтыфікаваць святыя месцы і тым сведчыць для хрысціян сапраўднасць іх веры. Акрамя таго заснавальнік жанру мусіў быў зрабіць свой твор дасканалым і пераканаўчым для чытачоў.

Па-першае, Данііл пералічыў імёны сваіх спадарожнікаў, якія маглі б пацвердзіць сапраўднасць яго слоў. Па-другое, як крыніцу звестак ён назваў на «мужа свята и стара деньми и книжна вельми», які жыў у Палестыне. Па-трэцяе, Данііл часткова выкарыстоўваў пісьмовыя матэрыялы, вядомыя ў часы яго вандроўкі. Па сярэднявечнай літаратуры хаджэнні вылучаюцца своеасаблівым персаналізмам. Вядома, асоба, ад імя якой вядзецца апавяданне ў старажытных хаджэннях, не звычайны падарожнік, а паломнік — чалавек, звязаны з рытуальнай і культавай сферай сярэднявечнай культуры.

На самым пачатку фарміраванне спосабу яго выяўлення было звязана з найбольш важнай мэтай, якую ставіў перад сабой ігумен Данііл: асабіста ідэнтыфікаваць святыя месцы і тым сведчыць для хрысціян сапраўднасць іх веры. Але ж зразумела, што самога па сабе сведчання адзінкавай асобы недастаткова для гэтага

Заснавальнік жанру мусіў зрабіць сваё сачыненне дасканалым і пераканаўчым для чытачоў, якія яшчэ даволі моцна залежалі ад эстэтыкі чацвёртае, аўтарытэт Данііла ўмацоўваўся добрым стаўленнем да яго караля крыжакоў Балдуіна. Гэты шэраг прыёмаў можна доўжыць яшчэ.

Разам з тым аўтар мусіў ужываць мастацкія сродкі тыпізацыі вобраза персанажа ў галіне спосабу яго выяўлення. Створаны ў Хаджэнні вобраз паломніка не ўкладваецца ў межы ніводнага з пануючых сты-

ляў. З прычыны канкрэтыкі ён не адпавядае патрабаванням ідэалізуючага біяграфізму. Ад таго, што апавяданню ўласцівыя біяграфічныя рысы, сам вобраз паломніка губляе манументальнасць. Рэалістычныя элементы таксама можна знайсці ў апавяданні. Але ж рэалізму як метаду тагачасная літаратура не ведае. Чалавек Даніла — «каліка вандроўны», і толькі ў гэтай якасці ён выступае «Руськой земли игуменом». Характарыстыка вельмі канкрэтная, звязана толькі з адной якасцю героя, адным яго ўчынкам — паломніцтвам. Даніїл увесь на Святой зямлі і ўвесь у сучаснасці, прычым хранатоп героя нерухомы: усё, што ёсць, існуе «заўсёды», «тут», «зараз» і «паасобку». Не толькі Даніїл прадстае фігурай, быццам бы шырока вядомай суайчыннікам, але і яго спадарожнікі павінны быць знаёмыя ўсім, накшталт былінных персанажаў, прычым дзеянні ўсёй паломніцкай «дэлегацыі» перанесены на дзеянні галоўнай яе асобы. Усё гэта характэрныя прыёмы эпічнага стылю. Вядома, як слушна пісаў Дз.С. Ліхачоў, «эпічны стыль у выяўленні людзей ні разу не абыймае літаратурны твор цалкам. ...Стыль гэты ў асноўным знайшоў увасабленне толькі ў вуснай народнай творчасці, а ў літаратуры ён часам адлюстроўваўся пад уплывам апошняга»[1]. Бясспрэчна, стыль «Хаджэння ігумена Данііла» — гэта не стыль былін: аўтабіяграфічныя, рэалістычныя, спавядальныя, дзелавыя элементы ў ім немагчымыя, бо пазбаўляюць эпічны стыль гераічнага пафасу, зніжаюць, «прызямляюць» яго. Гэта хутчэй эпіка казання, а можа, нават казкі ці якіхсці іншых вусных формаў апавядання «калікаў вандроўных», што да нашага часу не захаваліся.

Змяняюцца ці зусім знікаюць імёны і назвы, трансфармуюцца стылі і атрыбуты, а дзеянні і функцыі галоўнага персанажа застаюцца трывалымі, хоць досвед аўтара не можа паўтараць досвед папярэдніка. Але ў крышталізацыі гэтых функцый (паломнік-апавядальнік), калі свядомасць і хранатоп суб'екта паломніцтва выступаюць у якасці сродку авалодання жыццёвым матэрыялам, і бачыцца нам асноўны спосаб жанраўтварэння, па-рознаму рэалізаваны надалей рознымі мастацкімі стылямі, ці, дакладней, іх спалучэннямі. Сапраўднасць святых рэчаў і самога свету, яго Свяшчэннай гісторыі і самой светабудовы (бясконцага) выяўляецца толькі як сапраўднасць літаральнага чалавечага ўспрыняцця рэчаіснасці (канечнага) «телесныма очема», г. зн. на падставе вопыту ўзаемадзеяння з сакральнымі прадметамі і рэальным светам. Адсюль вынікае больш глыбокі ровень паўтарэння, на якім

паломнік-апавядальнік ёсць ужо архітыпічны персанаж, зусім адрозны ад адзінкавага, ад жывога аўтара-падарожніка, але ўвасоблены ў творы нібыта праз яго пасрэдніцтва.

У XII ст. паломнік-апавядальнік быў у літаратуры новым тыпам героя. Таму мы, здаецца, не памылімся, назваўшы персанажа ігумена Даніїла аўтарам-персанажам: усё, што яго датычыць, па сутнасці ўласна Даніілава, хоць прыёмы авалодання матэрыялам і нерэалістычныя. Наступныя ж помнікі былі непасрэдна зарыентаваныя на ўтвораную Даніілам мадэль. З'явіліся ўмоўна-асабовыя і зусім ананімныя помнікі. Відавочна, што пры такім становішчы размова пра аўтабіяграфічнасць можа ісці толькі з вельмі значнымі агаворкамі. Замест аўтара-персанажа з'явіўся суб'ект апавядання — тыповы «каліка вандроўны», стыль выяўлення якога стаў манументальным. У рэчышчы гэтай традыцыі створаны Хаджэнні Графенія, Стафана Ноўгарадца, дзяка Аляксандра, госця Васілія, Зосімы, а таксама «Апісанне Салуня» І. Смаляніна, «Во Иерусалим хожение», «Хаджэнне іераманаха Варсанофія ў Ерусалім» 1456 г. У XV ст. пачынаецца актыўны пераклад і перапрацоўка грэчацкіх праскінітарыяў, укладаецца новая рэдакцыя «Хаджэння ігумена Даніїла», з якой усе аўтабіяграфічныя моманты выключаюцца, і нарэшце, згодна з праскінітарнай мадэллю, пішуцца славянскія творы: Хаджэнні Васіля Пазнякова, Трыфана Карабейнікава, «Галіцка-Рускі падарожны аб святым горадзе Ерусаліме» і інш. Прысутнасць чалавека спачатку страчвае біяграфічныя рысы, а пасля зусім знікае.

З другога боку, калі мастацкая апрацоўка ўсяго спектру дакументальнага матэрыялу мае ў ігумена Даніїла непасрэдны характар у плане структураўтварэння (бо жанравай мадэлі не існавала), то ў іншых аўтараў — апасродкаваны. Гэта азначае такое пераўтварэнне арыгінальнага метаду ў агульную парадыгму мастацкага мыслення, пры якім адбываецца адасабленне ад непасрэдных крыніц як структуратворчых фактараў апавядання, што сведчыць пра з'яўленне новага, больш высокага роўню мастацкага абагульнення шляхам якаснай змены канцэптуальнага бачання чалавека і стылю яго выяўлення: ад аўтара-персанажа да суб'екта апавядання — тыповага «калікі вандроўнага». Змяніўся, такім чынам, не сам матэрыял, змяніўся модус яго выкарыстання [2].

Аднак умовы жыцця на працягу XIV–XV ст. карэнным чынам змяняюцца. Па-першае, на працягу болей, чым сто гадоў, амаль без пера-

пынку ішла знясільваючая вайна з крыжакамі. Эпізадычна мелі месца крывавыя сутыкненні паміж двума славянскімі княствамі — Літоўскім і Маскоўскім. Межы абодвух дзяржаў хутка пашыраліся, яны ўключалі ў свой склад розныя этна-палітычныя ўтварэнні. Па-другое, у сярэдзіне XIV ст. накаціўся жахлівы мор — чорная чума, якая за год – два спустошыла амаль на трэць землі Вялікага княства Літоўскага і дайшла да Масквы. Гэта абвастрала старыя і выклікала новыя праблемы, для развязвання якіх утвараліся адмысловыя гаспадарчыя суполкі, множыліся ерасі. Вельмі ўзрасла роля калектыўных намаганняў у сельскай гаспадарцы. Частка грамадства пачала імкнуцца да містыкі. Таму, як ні дзіўна, тыя ж сама культурна-гітарычныя ўмовы XIV ст. прыводзілі і да адваротнага, зусім процілеглага выніку: развязанне грамадскіх калізій патрабавала не толькі адмаўлення ад асабістага дзеля агульнай справы, але і надзвычай плённага развіцця чалавечых здольнасцяў. Надыходзіў час асоб моцных, дасведчаных у розных галінах жыцця, такіх, як Вітаўт, Сергій Раданежскі, мітрапаліт Кіпрыян. Той жа Ігнацій Смалянін быў і царкоўным дзеячам, і пісьменнікам, і дыпламатам, а паходзіў, магчыма, з вайскоўцаў. Выглядае, што markedly рознабаковасць асобы, добра адлюстраваная ў яго Хаджэнні, — адзін з прыкладаў характарыстыкі чалавека рэнесансавага складу, хоць да самой той эпохі заставалася болей чым сто гадоў.

Ігнацій усведамляе значнасць сваёй літаратурнай працы, добра ўяўляе незвычайнасць абставін, у якіх ён апынуўся. У творы намячаецца канкрэтызацыя выяўлення асобы, прычым не толькі сваёй: паломнік-апавядальнік не прыўзняты над навакольнымі, як «Руськой земли игумен», а супастаўлены з імі, дае ім асцярожную ацэнку, мае сярод іх начальнікаў і сяброў, суперажывае бедам апошніх і радуецца іх радасцям. Агульным для падарожнікаў становіцца хранатоп, які часткова секулярызуецца: час і прастора праяўляюцца ў контурах пабытавых дэталяў і з'яў, дынаміцы канкрэтных падзеяў, у рэалістычных пейзажах спустошаных берагоў Дона і бурнага Чорнага мора.

Вядома, сістэма выкладу не магла быць паслядоўнай, вымалёўваліся толькі агульныя рысы індывідуальных асоб і падзеяў. Але галоўным было свядомае адмаўленне ад манументальных сродкаў вобразатвору. Можа быць, спробай абагульнення стала ў Ігнація Смаляніна разуменне агульнасці лёсу ўсіх, хто гэтым часам на караблі, хто наагул вандруе. Пісьменнік нібы ўзнаўляе Даніілава панящце «мы», але дзякуючы асэнсаванню ролі выпадковасці ў жыцці пераводзіць яго з

ідэалагічнага ў мастацкі план: ён апавядае аб «нашай» вандроўцы, аб «нашым» агульным лёсе, які залежыць ад шматлікіх вонкавых абставін. Пра *такое* і *так* да Ігнацція яшчэ ніхто не пісаў. І зноў жа, як і ў ігумена Даніла, выяўленне чалавека ў Смаляніна не ўкладаецца ў межы пануючых стыляў і нават у межы ўстойлівых жанравых мадэляў. Гэтаксама, як Даніл звярнуўся ў свой час да фальклору, Ігнацій выкарыстоўваў магчымасці летапіснага жанру, летапіснага спосабу фіксацыі падзеяў, якім ён добра валодаў. Так склаўся непаўторны стылістычны строй яго твора, у якім спалучыліся розныя элементы: лірычныя і дакументальныя, часткова экспрэсіўныя і часткова манументальныя. На гэтым грунце фарміруецца новы тып паломніка-апавядальніка — аўтабіяграфічны персанаж, у стварэнні якога таксама ўзнаўляецца на іншай аснове прынцып стварэння аўтара-персанажа ігумена Даніла.

У гэтым жа рэчышчы пішацца ў XV ст. «Хаджэнне Варсанофія ў Егіпет, на Сінай і ў Палестыну» 1461–1462 гг. Цікава, што Варсанофій у многіх выпадках зусім адмаўляецца ад спроб мастацкага абагульнення і ад устойлівых традыцый паломніцкай літаратуры: па сутнасці, ён укладае дзённік адзінкавага падарожжа, які ў значнай ступені набліжаецца да ранейшых заходнееўрапейскіх узораў.

Наўпростая пераемнасць паміж творамі беларускай паломніцкай літаратуры была надалей страчаная. Таму жанр сапраўды адраджаўся ва ўмовах Беларускага Рэнесансу. Чалавек у «Перагрынацыі...» М.К. Радзівіла Сіроткі пачаў выяўляцца з гледзішча рэнесансавага рэалізму. Пісьменнік знайшоў сродак зрабіць апавяданне пра сябе займальным для чытача эпохі Вялікіх геаграфічных адкрыццяў: ён пачаў апісваць тое, што было невядома, вылучаючы элементы новага і адраджаючы антычныя нормы хараства, прыгожага, заснаваныя на вывучэнні прыроды і магічнага тайнапісу слядоў даўняй гісторыі. Пераадольваючы бар’еры, чалавек сам творыць свой лёс, ён імкнецца да самаўдасканалення, і гэтая ідэя творчай свабоды працінае ўсе роўні «Перагрынацыі...», замацоўваецца ў ёй як прынцып бессюжэтнага апавядання, абумоўленага воляй аўтара. Гуманістычны ідэал асобы ўвасабляецца ва ўсебаковым развіцці героя: ён дыпламат, географ, біёлаг, прыдворны, гісторык, філосаф, вайсковы начальнік, пісьменнік і г. д. Паломнік-апавядальнік тут — толькі аб‘ядноўваючы пачатак усіх якасцяў, якімі павінен валодаць сапраўдны рэнесансавы інтэлігент. Але не толькі ў пажаданай постаці паўстае перад чытачом

М.К. Радзівіл Сіротка. Яго сапраўдны партрэт і ў тым, што ён — знакаміты вяльможа, прыбраны ў вопратку «калікі», чалавек канкрэтнай эпохі і пэўнага стану са слугамі, коньмі, грашыма, дакументамі, хваробамі, са сваёй індывідуальнай і сямейнай гісторыяй, з нетыповай і не зусім зразумелай прагай да ірацыяналізму. Па сутнасці, гэта ўжо аўтар-герой біяграфічнага апавядання. Сродкі выяўлення сталі даволі дасканалымі, але адкрытасць, шчырасць ў звароце да чытача і ў імкненні да Бога ў гэтым вобразе страчаныя.

Як бачна, тып паломніка-апавядальніка рэалізуецца ў асобных творах па-рознаму. У «Хаджэнні ігумена Данііла» гэта аўтабіяграфічны персанаж. Сродкам яго стварэння стала спалучэнне эпічнага стылю, рэалістычных і манументальных элементаў у аповедзе. Пад уплывам культурна-гістарычных умоў метад ігумена Данііла «камянее», і ў Хаджэннях Дабрыні Ядрэйкавіча, Стафана Ноўгарадца, Графенія, у «Апісанні Салуня» І. Смалянiна і «Хаджэнні іераманаха Варсанофія ў Ерусалім» 1456 г. вызначальным становіцца манументальны стыль выяўлення, а замест жывога чалавечага вобраза з'яўляецца суб'ект апавядання — тыповы «каліка вандроўны». Рэалістычныя элементы час ад часу парушаюць ўстойлівыя схемы. На гэтым і сыходзяць на нішто «класічныя» хаджэнні, бо ў рэчышчы гэтай традыцыі адбываецца зварот да праскінітарных мадэляў стылю, дзе чалавека наагул няма. Але «Хаджэнне Ігнація Смаляніна» і часткова «Хаджэнне Варсанофія ў Егіпет, на Сінай і ў Палестыну» 1461–1462 гг. дэманструюць нараджэнне новага накірунку ва ўвасабленні агульнага: паломнік-апавядальнік паўстае ў выглядзе аўтабіяграфічнага персанажа. У першым помніку сродкам яго стварэння выступае спалучэнне традыцыйнай манеры літаратурных хаджэнняў і летапісных прыёмаў, што складае новую стылістычную манеру. У другім жа творы прасочваецца спалучэнне дзённікавага спосабу фіксацыі падзеяў падарожжа і звычайных прыёмаў жанру хаджэнняў. На гэтым шляху адбываецца развіццё дакументальна-нарысавай формы апавядання, узрастае значнасць аўтарскага пачатку ў паломніцкім аповедзе, замацоўваюцца рэалістычныя элементы стылю. У XVI ст. М.К. Радзівіл Сіротка стварае ў сваёй «Перагрынацыі...» вобраз аўтара — героя паломніцтва і жыцця.

Такім чынам, напярэдадні ўзнікнення першага ўласна мемуарнага твору — «Дыярыуша» Фёдара Еўлашоўскага — у беларускай літаратуры ўжо склаўся своеасаблівы тып вобразнасці: аўтабіяграфічны персанаж, які

фіксуе падзеі навакольнага свету са свайго прыватнага гледзішча і апавядае аб фактах уласнай біяграфіі. Няма сумневу, што Ф. Еўлашоўскі ведаў «Перагрынацыю...» М.-К. Радзівіла, бо служыў у яго. З другога боку, эпоха Рэнесансу і Рэфармацыі, адмаўляючы культ святых і рэлігійную сістэму духоўных каштоўнасцей, адмаўляла разам з тым і маральныя ідэалы, якія ўвасабляліся ў рэлігійнай літаратуры сярэднявечча. Перад грамадствам стала праблема выпрацоўкі новага маральнага ідэала, прычым ідэала вельмі канкрэтнага. У сваю чаргу, для грамадскай і індывідуальнай свядомасці эпохі Адраджэння быў, як вядома, уласцівы пэўны эгацэнтрызм як своеасаблівая рэалізацыя і трансфармацыя рэнесанснага антрапацэнтрызма і гуманізма. Натуральна, што гэта вяло да ўсведамлення каштоўнасці індывідуальных успамінаў, да асэнсавання іх асобаснай і грамадскай значнасці [3]. Прычым першапачатковыя мемуары і прызначаліся якраз пераважна для хатняга чытання, для дзяцей і ўнукаў [4].

І зусім натуральна было ў гэтых умовах зрабіць сваю асобу прадметам самавыяўлення з мэтай павучання іншых, інакш кажучы — паставіць сябе як узор на месца былых хрысціянскіх святых. Напэўна, першым да гэтай ідэі і прыйшоў навагрудскі падсудак Фёдар Еўлашоўскі, які, клапоцячыся пра духоўны дабрабыт сваіх нашчадкаў, вырашыў выхоўваць іх на ўласным прыкладзе: менавіта клопат пра дзяцей і ўнукаў, пра памяць рода, сям'і пры ўмове зараджэння рэнесансавага эгацэнтрызма ў грамадскай свядомасці стаў галоўным чыннікам узнікнення мемуарыстыкі ў Беларусі, а спосабы здзяйснення падобнай задумы ў літаратуры ўжо да таго часу саспелі. Акрамя таго, уплыў былога паломніцкага пісьменства адбіваўся ў мемуарыстыцы і далей: менавіта ў «Хаджэнні Ігнація Смаляніна» і ў «Перагрынацыі...» М.-К. Радзівіла сфарміраваўся такі спосаб фіксацыі жыццёвага матэрыялу, калі аўтабіяграфічны персанаж глядзіць на наваколле і ацэньвае «чужы» свет, у якім ён апынуўся, з пазіцыі «свайго» свету, выступаючы носьбітам і прадстаўніком сваёй культурна-гістарычнай традыцыі. На гэтай аснове былі складзеныя ў XVII ст. дыярыушы А. Каменскага-Длужыка і Т. Білевіча.

[1] Лихачев Д.С. Человек в литературе Древней Руси. М.: Наука, 1970. С. 71.

[2] Левшун Л.В. История восточнославянской средневековой словесности: Учебное пособие. Мн., 1998. С. 20–22.

[3] История белорусской дооктябрьской литературы.- Мн.: Наука и техника, 1977. С. 202–216.

[4] Мальдзіс А.І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.: Нарысы быту і звычаяў. Мн.: Маст. літ., 1982. С. 27.